А.А. Гужалоўскі,
прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт»,
доктар гістарычных навук, дацэнт

# Асаблівасці выкладання дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» слухачам перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці»

Дысцыпліна «Гісторыя музейнай справы» чытаецца слухачам, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі, што рэалізуецца ў Інбелкульце па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» [6]. Праграма дысцыпліны адрасавана практыкуючым музейным работнікам. Перад яе складальнікамі стаяла задача сабраць і прадставіць у кампактнай форме інфармацыю рэтраспектыўнага характару пра гісторыю развіцця музейнай справы.

Традыцыйна работнікі музеяў — спецыялісты, адданыя сваёй справе, шчыра і «несучасна» закаханыя ў музей. Адсутнасць у значнай іх часткі кваліфікацыі музеязнаўца кампенсуецца, як правіла, шматгадовым вопытам, талентам, жаданнем і ўменнем паглыбіцца ў сваю справу [5]. Вопыт перадаецца ад старэйшых да малодшых, ад майстра да вучня. У гэтым музейная справа падобна на традыцыйную культуру, і бачыцца нешта заканамернае ў тым, што традыцыя адыгрывае ў ёй гэткую ж важную ролю. Цяжэй за ўсё прыходзіцца тым музеям, дзе традыцыі няма. Мудрасць музейнай традыцыі абавязана захаваць, вывучыць і ўзбагаціць гісторыю музейнай справы (паводле тэрміналогіі З. Странскага — «гістарычная музеялогія»).

Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму работа музеяў Беларусі жорстка рэгламентавалася выпрацаванымі метадычнымі ўказаннямі і інструкцыямі. Музеялогіі, у тым ліку яе гістарычнага складніка, як самастойнай дысцыпліны не існавала. Лічылася відавочным, што музейны работнік павінен мець адукацыю, якая адпавядае профілю ўстановы. Пашырэнне сферы музейнай дзейнасці ў нашы дні прадугледжвае прымяненне спецыяльных музеялагічных ведаў, у тым ліку па яе гісторыі [3, с. 125—133]. Вывучэнне гістарычных працэсаў у галіне музейнай справы, узнаўленне і асэнсаванне гісторыка-музейных фактаў, падзей і персаналій дазваляюць супрацоўнікам музеяў бачыць у далёкім і блізкім мінулым вытокі сённяшніх дасягненняў і праблем, прадбачыць напрамкі развіцця музейнай справы ў будучым.

Разуменне любой з'явы альбо працэсу прадугледжвае знаёмства з іх гісторыяй. Гісторыя дазваляе лепш зразумець спецыфіку і этапы развіцця пэўнай навукі. Усё гэта адносіцца да музеялогіі. У ходзе гістарычных даследаванняў узнаўляецца карціна ўзнікнення музеяў, вызначаюцца месца і роля музеяў у гісторыі культуры на кожным з яе этапаў, аналізуецца каласальны вопыт папярэднікаў — многіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пакаленняў калекцыянераў і музейных работнікаў, разглядаецца фарміраванне асаблівай сферы культурнай дзейнасці, якую ўтвараюць музеі.

Вывучаць гісторыю заўсёды цікава. Аповед пра тое, як арыгінальныя ідэі нараджаліся, а потым увасабляліся ў жыццё, пераадольваючы шматлікія перашкоды, можа быць захапляльным. Знаёмства з нерэалізаванымі праектамі таксама абуджае творчую думку. Усведамленне таго, што беларускія музеі, выкарыстоўваючы еўрапейскі досвед, узбагацілі яго, адаптаваўшы да ўмоў сваёй краіны, а часам і апярэджвалі еўрапейскіх калег, нараджае пачуццё гонару за сваіх папярэднікаў.

Асобныя даследчыкі (напрыклад, Ж-А. Рыўер), спасылаючыся на афарызм «Лепшая тэорыя мастацтва — гэта яго гісторыя», разглядаюць вывучэнне гісторыі музеяў і іх ролю ў грамадстве як уласна прадмет музеялогіі. Зрэшты, спрэчка пра прадмет музеялогіі (у тым ліку гістарычнай музеялогіі як яе складніка) адносіцца да ліку дыскусійных праблем маладой навукі. Гэтыя дыскусіі неабходны на дадзеным этапе, яны з’яўляюцца абавязковай прыступкай станаўлення навуковай дысцыпліны.

Абапіраючыся на вопыт папярэднікаў, правамерна прапанаваць вызначэнне гісторыі музейнай справы як неад’емнай часткі гісторыі айчыннай культуры і складніка музеялогіі, якая вывучае музейныя працэсы ў іх гістарычнай дынаміцы.

Гісторыя музейнай справы выкарыстоўвае метады і дасягненні гістарычнай навукі, дапаможных гістарычных дысцыплін, мастацтвазнаўства, помніказнаўства, культуралогіі. Магчыма, развіццё навукі прывядзе да выпрацоўкі ўласных спецыфічных навуковых метадаў. Як правіла, метад, г.зн. спосаб пазнання, карэкціруецца адначасова з удакладненнем прадмета пазнання.

Адным з найважнейшых метадалагічных прынцыпаў выкладання гісторыі музейнай справы застаецца прынцып гістарызму, які прадугледжвае разгляд з’явы ў яе развіцці ад моманту зараджэння. Таму адным з асноўных метадаў, які выкарыстоўваецца падчас выкладання гісторыі музейнай справы, прасочваючы яе эвалюцыю, выяўляючы этапы і значныя вехі, з’яўляецца гістарычная перыядызацыя. Яе стварэнне — гэта спосаб арганізацыі ведаў у сістэму. Распрацоўка навуковай перыядызацыі сёння — важная метадалагічная задача побач з распрацоўкай мовы навукі. У паняццях і тэрмінах, якімі аперыруе навука, адбіваюцца і канцэнтруюцца дасягненні пазнання; навуковая перыядызацыя надае гэтым ведам сістэмнасць і іерархічнасць.

У працэсе выкладання дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» слухачам перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» асабліва значэнне (у адрозненне ад студэнцкай аўдыторыі) надаецца выкарыстанню гістарычных першакрыніц. Кожнаму гістарычнаму этапу ўласцівае ўласнае кола крыніц. Гісторыя музейнай справы Беларусі ахоплівае XVIII — XXI стст. Для гэтага перыяду характэрны наступныя віды гістарычных крыніц: заканадаўчыя акты, статыстычныя крыніцы, справаводчая дакументацыя, матэрыялы музейных нарад і канферэнцый, перыядычны друк, крыніцы асабістага паходжання (успаміны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзённікі, прыватная перапіска). Не менш значныя для разумення гісторыка-музейнага працэсу публікацыі музеяграфічнага характару (каталогі музеяў, выстаў, калекцый, збораў музейнага фонду краіны [7], аўкцыёнаў), а таксама справаздачы музеяў па навуковай рабоце і экспедыцыйныя справаздачы, музейныя даведнікі. Найважнейшымі крыніцамі па гісторыі канкрэтных музеяў з'яўляюцца ўліковая дакументацыя і матэрыялы музейнага праектавання. У ролі гістарычных крыніц па гісторыі музейнай думкі могуць выступаць музеялагічныя выданні, напрыклад «Школа музеялогіі» [8], «Музейны сшытак» [9], «Музеі Беларусі: Праблемы. Перспектывы. Інавацыі» [5].

Разрозненыя матэрыялы па гісторыі музейнай справы публікуюцца ў спецыяльнай навуковай літаратуры, музеязнаўчых перыядычных выданнях, вучэбнай літаратуры па музеязнаўству, працах па гісторыі культуры; даследаванні ў гэтай галіне ведаў праводзяць музеялагічныя цэнтры і многія музеі. Устойлівая цікавасць да вывучэння гісторыі музейнай справы, як лічыць большасць даследчыкаў, усталявалася ў свеце параўнальна нядаўна, пасля Другой сусветнай вайны. У Беларусі ўсплёск цікавасці да музейнай гісторыі назіраўся ў 1990—2000-я гг., што тлумачылася як павышэннем увагі да айчыннай гісторыі ў цэлым, так і працэсам фарміравання музеялогіі як самастойнай навуковай і вучэбнай дысцыпліны.

Сам музей як гістарычны феномен у сваім развіцці ўяўляе для грамадства ўсё большую цікавасць. Музеі, асабліва тыя, што маюць багатую шматгадовую гісторыю, вывучаюць і аднаўляюць яе. Для буйнейшых беларускіх музеяў у апошнія гады сталі актуальнымі даследаванні ў галіне ўласнай гісторыі. Але яны падобныя на часткі мазаікі, кожны з якіх імкнецца заняць адведзенае яму месца ў агульнай карціне. Сярод выданняў, якія абагульняюць мазаіку, — «История музеев мира» [1] і «Гісторыя музейнай справы Беларусі» [2].

Найважнейшай структурнай часткай дысцыпліны «Гісторыя музейнай справы» з'яўляюцца лекцыі, на якіх раскрываецца гістарычны шлях, пройдзены музеямі ў сусветным маштабе. Слухачам прапануюцца лекцыйныя заняткі, на якіх вывучаюцца наступныя тэмы: «Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метадалогія гісторыі музейнай справы»; «Дамузейнае збіральніцтва ў першабытным грамадстве, старажытным свеце і сярэдневякоўі»; «Узнікненне музея як сацыяльнага інстытута (XV — канец XVI ст.)»; «Фарміраванне музея як сацыяльнага інстытута (XVII — канец XVIII ст.)»; «Музейная справа ў перыяд буржуазных рэвалюцый канца XVIII — першай паловы XIX ст. З'яўленне публічных музеяў як вынік рэалізацыі сацыяльных патрабаванняў мас»; «Пашырэнне музейнай сеткі і ўзмацненне спецыялізацыі музеяў у другой палове XIX — пачатку XX ст.»; «Музейная палітыка і музейная справа паміж дзвюма сусветнымі войнамі (1918—1939 гг.)»; «Музейная палітыка і музейная справа пасля Другой сусветнай вайны».

Другім па важнасці кампанентам дысцыпліны з'яўляюцца семінарскія заняткі, на якіх разглядаецца айчынная гісторыка-музейная праблематыка: «Гісторыя прыватнага збіральніцтва Беларусі»; «Першыя айчынныя музеі ў другой палове



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVIII — пачатку XX ст.»; «Станаўленне музейнай справы ў БССР у 1919—1941 гг.»; «Музеі Заходняй Беларусі»; «Аднаўленне музейнай дзейнасці БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе»; «Музейная справа БССР у сярэдзіне 1950-х — сярэдзіне 1960-х гг.»; «Музейная справа БССР у 1968—1991 гг.».

На практычных занятках разглядаюцца «кейсы» — канкрэтныя складаныя сітуацыі (выпадкі), якія назіраліся ў музейнай практыцы Рэспублікі Беларусь на працягу 1991—2015 гг. Падобныя «кейсы» ўпершыню ўводзяць у беларускі музеялагічны кантэкст матэрыял, прысвечаны рабоце музеяў як з традыцыйнымі калекцыямі, нерухомымі, асяродкавымі і нематэрыяльнымі аб’ектамі, так і з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў. Усе віды аўдыторнай работы суправаджаюцца ілюстрацыйнымі матэрыяламі ў электронным фармаце. Да кожнай структурнай часткі слухачам прапануецца асобны спіс літаратуры, які змяшчае назвы ключавых навейшых публікацый.

Падчас падрыхтоўкі да семінарскіх і практычных заняткаў слухачы выкарыстоўваюць не толькі выданні, але і інфармацыю з інтэрнэт-крыніц.

Спрыяе падрыхтоўцы работа слухачоў у спецыялізаванай аўдыторыі Інбелкульта «Музейнае праектаванне», адкрытай у 2015 г., у якой можна азнаёміцца з дакументацыяй і матэрыяламі музейных праектаў, навукова-метадычнай літаратурай.

У працэсе падрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» важную ролю адыгрываюць новыя адукацыйныя тэхналогіі. Прыярытэтным з’яўляецца стымуляванне і арганізацыя адукацыйнай актыўнасці слухача: уцягванне ў дыялог, дыскусію, праблематызацыя адукацыйнага працэсу. Спроба самастойна або разам з групай вырашыць задачу, прычым актуальную для музейнай практыкі, ляжыць у аснове сучасных педагагічных прыёмаў. Прызначэнне інавацыйных тэхналогій (у тым ліку такіх, як тэхналогія развіцця крытычнага мыслення, праектныя і трэнінгавыя тэхналогіі), што ўключаюць імітацыю прафесійнай дзейнасці, — спрыяюць таму, каб слухач сам прайшоў той шлях, які прыводзіць да патрэбнага выніку. Пры гэтым важна, каб ён усвядоміў уласны рух і сэнс сваёй дзейнасці.

У рабоце са слухачамі ўлічваюцца тэндэнцыі развіцця музеяў свету ў іх часовым вымярэнні, а таксама асаблівасці канкрэтных музейных сітуацый. Прыкладам можа служыць інтэграцыя музейных прафесій, што вядзе да ўзмацнення сувязі паміж спецыялістамі, адны з якіх ажыццяўляюць навуковае праектаванне музейных экспазіцый, другія — рэалізуюць культурна-адукацыйную дзейнасць. І першыя, і другія павінны валодаць гісторыка-музейнымі ведамі, якія і ў праектаванні музейных экспазіцый і ў музейна-педагагічнай дзейнасці забяспечваюць выкарыстанне лепшага вопыту папярэднікаў.

Менавіта спецыяліст па рабоце з музейнай аўдыторыяй (экскурсавод, музейны педагог або медыятар) дэманструе разнастайныя музейныя калекцыі і раскрывае іх каштоўнасць, ажыццяўляе інтэрпрэтацыю культурнай спадчыны, тлумачыць значнасць артэфактаў культуры і ўключае музейную публіку ў займальны дыялог куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тур [4]. Мэта яго дзейнасці, вынікам якой могуць быць адукацыйныя праграмы або арт-праекты, навуковыя публікацыі або экскурсіі, відэафільмы і мультымедыйныя праграмы, прэзентацыі ці культурныя акцыі, — гэта пагружэнне аўдыторыі ў свет культуры, усведамленне асобай, сацыяльнай групай, грамадствам у цэлым таго, што музей заўсёды быў, ёсць і будзе з'яўляцца цэнтрам міжкультурнай камунікацыі, а яго калекцыі ўтвараюць своеасаблівыя масты паміж мінулым, сучасным і будучым, прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей і рэлігій, носьбітамі розных моў і культурных традыцый.

Такім чынам, дысцыпліна «Гісторыя музейнай справы» заклікана фарміраваць у слухачоў усведамленне гістарычнай місіі музея, адказнасць за захаванне культурнай спадчыны, засваенне яе інфармацыйнага патэнцыялу і трансляцыю яе каштоўнасцей і сэнсаў. Яна дапамагае музейным спецыялістам XXI ст. мадэляваць і ўвасабляць у жыццё сучасныя стратэгіі развіцця культуры і грамадства, абапіраючыся на шматвяковы вопыт дзейнасці музеяў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Грицкевич, В.П.* История музеев мира : учеб. пособие / В.П. Грицкевич, А.А. Гужаловский. — Минск : БГУ, 2003. — 283 с.
2. *Гужалоўскі, А.А.* Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапаможнік / А.А. Гужалоўскі. — Мінск : БДУ, 2012. — 303 с.
3. *Гужаловский, А.А.* Подготовка музейного персонала / А.А. Гужаловский // Первый национальный форум «Музеи Беларуси» : сб. материалов деловой программы (Гродно, 12—14 окт. 2012 г.) / сост., общ. ред. И.Б. Лаптенок. — Минск : Ин-т культуры Беларуси, 2013. — С. 125—133.
4. *Мастеница, Е.Н.* Музейный специалист XXI века : хранитель? исследователь? музеолог? / Е.Н. Мастеница // Альманах современной науки и образования. — Тамбов : Грамота, 2015. — № 9.
5. Музеі Беларусі : Праблемы. Перспектывы. Інавацыі : Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць / укл., пер. з рус. мовы, агул. рэд. І.Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — 231 с. : іл.
6. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Переподготовка руководящих работников и специалистов, имеющих высшее образование. Специальность 1-23 02 73 «Коммуникация в сфере музейной деятельности» / Е.А. Макарова, И.Б. Лаптёнок, А.Б. Сташкевич, А.А. Кушнеревич. — Минск : Мин-во обр. Респ. Беларусь, 2013. — 17 с.
7. Скарбы музеяў Беларусі = Сокровища музеев Беларуси = Treasure of Belarusian Museums / укл. І.Б. ; аўт. прад., навук. рэд.: А.А. Гужалоўскі; фотаздымкі: В.А. Сібрыкаў, А.Р. Булва, Д.М. Казлоў. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2014. — 430 с. : іл.
8. Школа музеялогіі : навучальныя праграмы / навук. рэд. А. Калбаска. — Мінск : БелІПК, 1997. — 65 с.
9. Экспазіцыя ў музейнай прасторы : праектны менеджмент (Музейны сшытак) / уклад., агульн. рэд. І.Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», Лапцёнак 2012. — 100 с. : іл.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ